**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Савецкая, 9,
220010, г. Мінск
тэл. 327-47-36, факс 200-84-83
E-mail: info@edu.gov.by

**МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ул. Советская, 9
220010, г. Минск
тел. 327-47-36, факс 200-84-83
E-mail: info@edu.gov.by

27.11.2024 № 02-01-24/29-Кол-(Э)-0/14012400000943
На № ____________ от ____________

[redacted]

[redacted]

У Міністэрстве адукацыі разгледжаны калектыўны электронны зварот аб павелічэнні колькасці гадзін па вучэбным прадмеце “Гісторыя Беларусі”. Паведамляем наступнае.

У адпаведнасці з дзеючымі адукацыйнымі стандартамі і Канцэпцыяй школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, адобранай Пастановай калегіі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 08.11.2022 № 13.2, гісторыя Беларусі вывучаецца на трох ступенях агульнай сярэдняй адукацыі: на I ступені – вучэбны прадмет «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь», на II ступені – вучэбны прадмет «Гісторыя Беларусі», на III ступені (2024/2025 вучэбны год) – вучэбны прадмет «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» (X клас), вучэбны прадмет «Гісторыя Беларусі» (XI клас).

У мэтах важнасці актыўнага ўключэння вучняў у сучаснае сацыякультурнае асяроддзе на аснове асэнсавання гістарычнага вопыту беларускай нацыі ў кантэксце гісторыі чалавецтва, засваення сістэмы традыцыйных каштоўнасцей, фарміравання гістарычнай памяці і грамадзянскай ідэнтычнасці з 1 верасня 2024 г. у X класах вывучаецца вучэбны прадмет «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» замест прадметаў «Сусветная гісторыя» і «Гісторыя Беларусі», якія вывучаліся раней.

Акрамя таго, вывучэнне гісторыі Беларусі можа быць арганізавана на павышаным узроўні ў VIII, IX, XI класах, а таксама ў X классе ў рамках вывучэння вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі».

Для вучняў, якія праяўляюць асаблівую цікавасць да вывучэння гісторыі Беларусі, прапануюцца наступныя факультатыўныя заняткі: «Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай», «Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі: фарміраванне індустрыяльнага грамадства і нацыі (канец XVIII – пачатак XX ст.)», «Палітыка беларусізацыі ў 1920-я гг.», «Ад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі да Рэспублікі Беларусь:

выбар шляхоў развіцця», «Асновы этнаграфіі Беларусі», «Храмы, замкі і палацы Беларусі» і інш. Вучэбныя праграмы размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале.

Такім чынам, на вывучэнне гісторыі Беларусі прадугледжана дастатковая колькасць гадзін як на вучэбных, так і на факультатыўных занятках.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З «Об обращениях граждан и юридических лиц» адказ Міністэрства адукацыі можа быць абскарджаны ў суд у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Начальнік Галоўнага ўпраўлення
агульнай сярэдняй і дашкольнай
адукацыі

М.С.Кіндзірэнка

02-01 Булаўкіна 222 65 31